# ФАРМІРАВАННЕ ЎЯЎЛЕННЯЎ АБ ПРЫНЦЫПАХ УРАЧЭБНАЙ ЭТЫКІ ПРЫ ВЫВУЧЭННІ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

**Клімавец В.П.**
*Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт*
*Беларусь, Мінск*

Артыкул прысвечаны фарміраванню ўяўленняў аб урачэбным абавязку, аб узаемаадносінах урача і хворага. Аўтар паказвае на прыкладах са сваёй педагагічнай дзейнасці, якія метады і сродкі садзейнічаюць выхаванню будучых медыкаў.

*Ключавыя словы: дэанталогія, адукацыя, моўныя нормы, выхаванне, самавыхаванне, мастацкі вобраз урача.*

«Слоўнік запазычаных слоў» тлумачыць паняцце «этыка» як «сістэма нормаў маральных паводзін асобы, якой-небудзь грамадскай ці прафесіянальнай групы (напр., урачэбная этыка)». Пры вывучэнні медыцыны ўжываецца яшчэ тэрмін «дэанталогія» [гр. deon (deontos) – павінна, трэба + логія] – вучэнне аб абавязку, якое складае раздзел этыкі. Пад медыцынскай дэанталогіяй мы разумеем сукупнасць этычных нормаў і прынцыпаў паводзін медыцынскага работніка пры выкананні сваіх прафесійных абавязкаў.

Шмат гадоў выкладаючы беларускую мову на падрыхтоўчым аддзяленні БДМУ, я пераканалася, што родная мова дае багатыя магчымасці ў фарміраванні светапогляду і выхаванні лепшых чалавечых якасцей будучых урачоў.

Знаёмства са слухачамі я штогод пачынаю з анкетавання, мэтай якога з'яўляецца жаданне хутчэй зразумець, чым цікавіцца малады чалавек, чаму для навучання абраў беларускую мову, наколькі ён абазнаны ў беларускай культуры. Але, апроч гэтага, у анкеце ёсць пытанні, скіраваныя на самааналіз: «Хто паўплываў на ваш выбар прафесіі ўрача?», «Чаму вы абралі іменна гэтую прафесію?», «Якія якасці характару, на ваш погляд, павінны пераважаць ва ўрача?», і інш.

Адказы на пытанні аб матывах выбару прафесіі розныя, але пра тое, што прафесія ўрача па плячы не кожнаму, што яна накладвае на прадстаўніка медыцыны невымерную адказнасць за жыццё і лёс хворага чалавека, маладыя людзі часам яшчэ не вельмі задумваюцца.

Задача выкладчыка – скіраваць думкі і дзеянні маладых людзей у патрэбным кірунку, прымусіць іх разважаць. Праграма па беларускай мове прадугледжвае авалоданне арфаграфічнымі, арфаэпічнымі, сінтаксічнымі, словаўтваральнымі, лексічнымі нормамі беларускай мовы. Навучэнцы павінны засвоіць мову настолькі, каб нязмушана, звязна перадаваць змест прачытанага, выказваць свае думкі і вусна, і пісьмова. Выкладчык павінен навучыць уменню выкладаць свае думкі паслядоўна, лагічна, звязна, правільна будаваць сказы, вытрымліваць патрабаванні да таго ці іншага стыляў, пазбягаць расплывістасці і няяснасці. Мова выказвання павінна быць даходлівай, зразумелай, дакладнай і інфарматыўнай, у той жа час і сціслай. Навучэнцы ведаюць, што ў праграме

медыцынскай ВНУ няма такой дысцыпліны, што вывучала б навуковую творчасць як працэс, часткай якога з’яўляецца якаснае літаратурнае афармленне навуковых работ.

Як заўважае Ю.К. Абаеў, «нездавальняючае літаратурнае афармленне медыцынскіх работ мае характар масавай з’явы. Падрыхтоўка навуковай работы на высокім моўным узроўні – няпростая задача. Толькі настойлівай працай пры наяўнасці неабходных ведаў па мове і літаратуры дасягаецца дасканаласць у выкладзе, якая любую складаную думку робіць зразумелай».

Па гэтай прычыне развіццю вуснай і пісьмовай мовы на занятках неабходна надаваць самае вялікае значэнне.

І потым на працягу навучальнага года, засвойваючы неабходныя веды, авалодваючы трывалымі ўменнямі і навыкамі, абітурыенты пастаянна ўдасканальваюць і свае асабістыя чалавечыя якасці і павышаюць інтэлектуальны ўзровень. Гэтаму служаць самастойнае прачытанне розных мастацкіх твораў, іх абмеркаванне на занятках, наведванне ўстаноў культуры, удзел ва ўніверсітэцкіх мерапрыемствах.

Паступова навучэнцы разумеюць, наколькі цяжкай і адказнай з’яўляецца прафесія ўрача, якая патрабуе пастаяннага ўнутранага напружання, работы над сабой – самавыхавання. Здольнасць увесь час ўдасканальвацца, не спыняцца ў сваім развіцці, самастойна авалодваць новымі ведамі – абавязковае патрабаванне да прадстаўнікоў гэтай прафесіі. Бо гэта такая сфера дзейнасці, якая сапраўды вымагае ўсіх лепшых чалавечых якасцей. Недарэмна аўстрыйскі тэрапеўт і неўрапатолаг Герман Нотнагель калісьці сказаў: «Добрым урачом можа быць толькі добры чалавек».

А.М. Горкі называў шараговых дактароў «маленькімі вялікімі людзьмі», бо быць урачом – гэта не толькі валодаць сваёй навукай і ўмець лячыць, але і ведаць як мага больш аб жыцці. Гэта мастацтва, музыка, тэатр, добрая літаратура. Прачытаўшы цікавую, пазнавальную і карысную кнігу, чалавек будзе лепш разумець і сябе, і іншых людзей. А разумець людзей, знаходзіць з імі агульную мову – адзін з галоўных прынцыпаў дэанталогіі.

Патрабаванні да ўрача склаліся яшчэ ў старажытнасці. Аб якасцях, якімі павінен валодаць лекар, гаварылі творы, што выйшлі са школы старажытнагрэчаскага ўрача Гіпакрата (каля 460 – каля 370 гг. да н.э.). Гэта «Клятва», «Закон», «Аб доктару», «Аб спрыяльных паводзінах».

Згодна з Гіпакратам, ідэалам з’яўляецца ўрач-мудрэц. «Усё, што шукаецца ў мудрасці, усё гэта ёсць і ў медыцыне: пагарда да грошай, сумленнасць, сціпласць, прастата ў адзенні, павага, разважлівасць, рашучасць, ахайнасць, багацце думак, веданне ўсяго таго, што карысна і неабходна для жыцця, агіда да заган, адмаўленне забабоннага страху перад багамі, боская перавага» («Аб спрыяльных паводзінах»).

Нельга быць доктарам, не ўдасканальваючыся ў прафесіі. Заўважым, што за ўсю гісторыю развіцця медыцыны ў «Клятву Гіпакрата» было ўнесена адзінае дапаўненне. Гэта адбылося на Другім сусветным дэанталагічным кангрэсе ў Парыжы. Гучыць яно так: «Клянуся вучыцца ўсё жыццё».

Але ж прафесійную патрыхтоўку нельга аддзяліць ад маральнага выхавання.

Старадаўняе іранскае выслоўе гаворыць: «Тры сродкі ёсць у доктара: слова, расліна і нож». На першым месцы стаіць «слова» як уздзеянне ўрача на псіхіку хворага, на яго думкі, настрой, волю. На думку Мацвея Якаўлевіча Мудрова, славутага расійскага доктара, «ёсць і душэўныя лекі з навукі мудрасці, часцей з псіхалогіі… Гэтым мастацтвам перадаецца хворым тая цвёрдасць духу, якая перамагае цялесныя хваробы, скруху, мітусню».

Вялікую ролю ў выхаванні будучых урачоў адыгрывае мастацкая, навуковая, публіцыстычная літаратура.

На пачатку навучання прапаноўваю слухачам прыкладны спіс твораў айчыннай і замежнай літаратуры, дзе разглядаюцца розныя аспекты працы медыкаў і абмаляваны яскравыя запамінальныя вобразы ўрачоў.

Гэта раман А. Асіпенкі «Клетка для берасцянак», дзе адзін з галоўных герояў – выбітны хірург Канстанцін Вячаслававіч Цярпілоўскі, генерал медыцынскай службы. Будучы ў эвакуацыі ў Ташкенце, ён, не шкадуючы сябе, выратаваў сотні параненых байцоў (падзеі твора разгортваюцца ў гады Вялікай Айчыннай вайны). Але па даносе зяця-сталініста найталенавіцейшы ўрач быў арыштаваны і памёр у турме…

Аповесць В. Карамазава «Краем Белага шляху» ставіць вельмі вострыя праблемы постчарнобыльскага часу. Галоўны герой – раённы хірург Валетаў, добры спецыяліст і чалавек. Але людзі жывуць у забруджанай зоне, пакутуюць ад хвароб, заўчасна паміраюць. Доктар не можа ім дапамагчы. Пакутуючы ад свайго бяссілля, доктар шукае збавення ў п’янстве.

Запамінаецца аповесць пісьменніка А. Федарэнкі «Ланцуг», герой якой таксама доктар, зусім яшчэ малады Жэня Вінярскі. Яму ўсяго 28 гадоў, але гэта ўжо закончаны цынік. Ён грэбліва ставіцца да хворых, не паважае сваіх калег і нават выкрадае грошы ў старэйшага доктара Стэльмаха, якія той збірае на аперацыю хворай дачкі.

Адзін з персанажаў аповесці, Васіль, гаворыць Вінярскаму пра свае пакуты ў бальніцы, куды яго прывезлі з паламанай нагой: «Да ночы праляжаў у прыёмным пакоі – то не маглі знайсці рэнтгенолага, то не было каму накласці гіпс, – але ўрэшце сяк-так наклалі, прывезлі ў палату, скінулі, як калоду, на ложак… Ні ўколу, ні таблеткі, і каго зваць, каго прасіць?.. Боль люты, вачэй не самкнуў да самай раніцы, трэсла ўсяго, як малярыйнага.

– … Дык якія павінны быць дактары? – пытаецца Васіль. – Ды які б я ні быў: п’яны, дурны, несімпатычны табе – я ж перш за ўсё хворы, бездапаможны, аддаюся пад тваю ўладу!.. Ты ж даваў нейкую клятву Гіпакрата! Ды хоць зірні ты інакш, скажы хоць адно добрае слова, абнадзей – гэта будзе ў 100 разоў лепш за любыя лекі…»

Нельга абмінуць і аповесць В. Андрушчука «Стрыжань», якая высвечвае многія пытанні ўзаемаадносінаў хворых і лекараў. Напрыклад, ці варта паведамляць пакутнікам аб іх невылечным дыягназе? Аўтар даказвае, што ўсё

залежыць ад канкрэтнай сітуацыі, ад даверу хворага да ўрача.

У кнізе Я.А. Вагнера «Роздум аб урачэбным абавязку» распавядаецца аб гісторыі хваробы Мікалая Іванавіча Пірагова, славутага рускага доктара, у якога ў пажылым узросце на верхняй сківіцы з'явілася язвачка, што ніяк не зажывала. Пасля кансіліуму вынеслі вердыкт: злаякаснае новаўтварэнне, патрэбна аперацыя. Настрой у Пірагова быў вельмі кепскі. Для аперацыі ён выехаў у Вену, у клініку славутага прафесара таго часу Т. Більрота. Той адверг вывады кансіліуму, сказаў, што аператыўнае ўмяшанне не патрэбнае. Пасля кансультацыі ў Більрота настрой Пірагова палепшыўся, ён прымаў хворых, працаваў у садзе, ездзіў на кані, пакуль хвароба не ўзяла сваё…

Вельмі правільна зрабіў Більрот: ён падараваў Пірагову надзею, хаця добра разумеў, што хвароба запушчана і аперацыя бесперспектыўная. Більрот на параўнальна кароткі час забяспечыў хвораму не азмрочанае цяжкімі перажываннямі існаванне.

Вялікім выхаваўчым патэнцыялам валодае знакаміты раман польскага пісьменніка Тадэвуша Даленга-Мастовіча «Знахар». Прафесар Вільчур, галоўны герой твора, у выніку трагічных акалічнасцей страчвае памяць, губляе высокае грамадскае становішча, працу і сям'ю, становіцца бадзягам. Але ў яго сэрцы жыве любоў да людзей і жаданне дапамагаць хворым і нямоглым. Антыподам галоўнага героя з'яўляецца доктар медыцыны Паўліцкі, які мае невысокую кваліфікацыю, але прэтэндуе на лідарства ў лячэнні хворых. Кульмінацыяй твора з'яўляецца апісанне аперацыі дзяўчыны Марысі, якая атрымала цяжкую чэрапнамазгавую траўму. Доктар Паўліцкі, абыякава зірнуўшы на Марысю, сказаў, што яна памрэ і рабіць ёй што-небудзь бессэнсоўна. Антоній жа імкнуўся дапамагчы пацярпелай любой цаной. Каб зрабіць аперацыю, патрэбны былі інструменты, і Антоній выкрадае іх у доктара Паўліцкага. Дзяўчына выжыла і паправілася, а Антоній апынуўся за крадзеж у турме…

У рамане Арчыбальда Джозефа Кроніна «Цытадэль» доктар Эндр'ю Мэнсан ратуе ў шахце, дзе адбыўся абвал, рабочага Сэма Бівена. Левае перадплечча Сэма было прыдаўлена і расціснута цяжарам глыбы, якая трымала яго ў палоне. Аўтар распавядае: «Эндр'ю адразу ўбачыў, што адзіны спосаб вызваліць Бівена – ампутаваць руку. І Бівен, вочы якога памуціліся ад болю, прачытаў гэтае рашэнне на твары Эндр'ю ў той самы момант, калі яно было прынята. Але па дарозе на руднік памочнік доктара не ўтрымаў сумку, і склянка з хлараформам разбілася. Лежачы ў лужыне гразі пад пагрозай смерці ад каменнай глыбы, што навісла над галавой, доктар робіць ампутацыю.»

Неацэннае выхаваўчае значэнне маюць кнігі Ф.Р. Вуглова, у прыватнасці «Чалавек сярод людзей» і «Сэрца хірурга».

Фёдар Рыгоравіч Вуглоў – сусветна вядомы хірург, акадэмік – пражыў 103 гады. Апошнюю аперацыю ён правёў у стагадовым узросце, за што быў занесены ў Кнігу рэкордаў Гінеса як самы стары хірург-практык.

У 2020 годзе да 110-годдзя з дня нараджэння Ф.Р. Вуглова ў Маскве выйшла кніга «Парады стагадовага хірурга» (серыя «Медыцынскі бестселер»). І вось гэту

выдатную кнігу завяршае раздзел «… І аб любові». Думаецца, што самае галоўнае, што хацеў сказаць аўтар, выкладзена тут.

«У грамадстве павінна панаваць любоў да людзей. Ніхто на зямлі не забівае сабе падобных, ніхто – акрамя чалавека…

І другое, што не менш важна, – не рабіць зла. Тут няўмольна дзейнічае закон: што пасеем, тое і пажнём…» – сцвярджае аўтар.

Зараз чалавецтва змагаецца з новым злом – каранавірусам. На пярэднім краі барацьбы – дактары, якія прынялі на сябе ўвесь цяжар невядомай хваробы і многія з якіх загінулі…

Такім чынам, прафесія ўрача – гэта падзвіжніцтва, служэнне людзям без свят і выхадных… Як гаварыў Ф.Р. Вуглоў, «рабі людзям дабро і не чакай за гэта ўзнагароды».

**Літаратура**

1. Абаев, Ю.К. Культура речи врача // Здравоохранение. – 2011. – №1. – С.30-34.
2. Вихров, Е. Раздумья о врачебном долге. – Пермь, 1986. – 221 с.
3. Карамазаў, В. Краем Белага шляху. – Мінск: «Мастацкая літаратура», 1994. – С.3-128.
4. Кронин, А. Цитадель. – Кишинев, 1975. – С.3-375.
5. Углов, Ф. Советы 100-летнего хирурга. – М.: АСП, 2020. – 320 с.
6. Федарэнка, А. Ланцуг // Маладосць. – 1994. – №9. – С.81-151.
7. Хейли, А. Окончательный диагноз. – Минск: «Вышэйшая школа», 1990. – С.3-160.

## THE FORMATION OF IDEAS ABOUT PRINCIPLES OF MEDICAL ETHICS IN BELARUSIAN LANGUAGE CLASSES

**Klimavets V.P.**
*Belarusian State Medical University*
*Belarus, Minsk*

The article is dedicated to the forming perceptions of a medical debt, the relationships between a doctor and a patient. The author shows with an example from his pedagogical activity which methods and means contribute to education of future doctors.

*Keywords: deontology, education, language norms, self-education, artistic image of a doctor.*

## ПРЕПОДАВАНИЕ РКИ В УСЛОВИЯХ ЦИФРОВОЙ ТРАНСФОРМАЦИИ ВЫСШЕЙ ШКОЛЫ

**Ковынева И.А., Петрова Н.Э.**
*Курский государственный медицинский университет*
*Россия, Курск*

В статье даётся описание некоторых подходов к работе с иностранными студентами в курсе русского языка как иностранного (РКИ) в условиях цифровой образовательной среды. К рассмотрению предлагаются письменные работы иностранных